*Галіна Адамовіч*

# КАЗКА І ЯЕ «ЗАЛАТЫ ФОНД»: ДА ПЫТАННЯ АБ ІЕРАРХІІ Ў СІСТЭМАХ ФАЛЬКЛОРУ І ЛІТАРАТУРЫ

Вядомы дзве казкі: «Воўк і сабака» і «Сабака і воўк».

Казка «Воўк і сабака» пачынаецца наступным чынам: «*Быў у аднаго гаспадара сабака. Як ён пастарэў, гаспадар прывёз маладога, а яму ўжо есці не давалі. Аднаго разу выбег ён у поле і сустрэўся з ваўком, з якім знаўся з маленства. Воўк пытае ў яго:*

*– Чаму ты, браце, гэтакі худы?*

*– А каб ты ведаў, братка,– кажа сабака,– гаспадар прывёз на маё месца маладога, а мне ўжо есці не дае.*

*– Пачакай,– кажа воўк,– я так зраблю, што будуць зноў табе есці добра даваць, толькі мяне паслухай, што я табе скажу…*» [7, *24*].

Казка «Сабака і воўк» таксама пачынаецца з завязкі: «*Неяк пасябравалі воўк і сабака і кожны дзень наведвалі адзін аднаго. Аднойчы пачуў сабака, што гаспадары кажуць пра яго:*

*– Стары стаў наш сабака, нічога не варты. Як з ім быць? Проста выгнаць ці забіць і скуру садраць?*

*Спужаўся сабака і пабег да ваўка.*

*– Што мне рабіць? Вось што я чуў ад сваіх гаспадароў. Ці не параіш мне што-небудзь?*

*Засмяяўся воўк.*

*– Не хвалюйся. Я адну хітрасць надумаў…*» [2, *53*].

Першая казка – японская, другая – беларуская. Суадносіны (як падабенствы, так і адрозненні) паміж японскай і беларускай казкамі ў сістэме фальклорных жанраў, паміж казкай і некаторымі іншымі жанрамі ў сусветнай літаратуры дазваляюць сфармуляваць пэўныя высновы адносна месца беларускай класічнай літаратуры ў кантэксце сусветнай класікі.

Першая выснова базіруецца на супастаўленні «залатога фонду» беларускай літаратуры і «залатога фонду» сусветнай літаратуры, вобразна названых намі Парнасам беларускай і Алімпам сусветнай класікі. «Піраміды» сусветнай і нацыянальнай класікі ў сістэме «літаратура» неадпаведныя. Класіка сусветнай літаратуры мае іерархічны характар. Намі ўмоўна вылучаны яе ўзроўні: «10»; «100»; «10 х 100» першых (лепшых) – класіка нацыянальных літаратур [1, *161–195*].

Так, «першая дзесятка» канона ўключае імёны Гамера, Дантэ, Шэкспіра, Сервантэса, Гётэ, Байрана, Пушкіна... Лічба «100» з’яўляецца невыпадкова: у апошнія дзесяцігоддзі ХХ ст. пашырылася тэндэнцыя выдаваць зборнікі «100» лепшых [3], у якіх названы імёны найбольш значных аўтараў у сусветнай літаратуры: Авідзій, Д. Бакача, В. Гюго, Ч. Дзікенс, Д. Дэфо, Р. Тагор і іншыя. Пошукі «Вялікага Пісьменніка ХХ стагоддзя» прывялі да адмысловага адбору творцаў у выданне «Великие

писатели XX века» [3]. У лік «вялікіх» у памерах сусветнай літаратуры ўключаны Я. Купала, У. Караткевіч, В. Быкаў. «10 x 100» – гэта класіка літаратур «малых» народаў, якія не трапілі ў рэчышча тых, што вызначаюць характар і кірункі сусветнага літаратурнага працэсу, але менавіта дзякуючы каму існуе глыбокая плынь сусветнага літаратурнага працэсу, а сама літаратура прадстаўлена ў яе шматстайнасці і шматфарбнасці. У пэўныя моманты літаратурнага развіцця менавіта ў творчасці прадстаўнікоў «малых» народаў больш выразна праяўляецца тая ці іншая тэндэнцыя. У кнізе «Лепшае ў сусветнай літаратуры» *(*14-е выд., ЗША, 1994) названы Ф. Скарына, Ф. Багушэвіч, Я. Колас, Я. Купала, М. Багдановіч, У. Дубоўка, М. Танк, Я. Брыль, В. Быкаў (у агульным аглядзе беларускай літаратуры) і дадзены адзін асобны артыкул – «В. Быкаў» [8, *783–784*].

Дзве структуры – канон (Алімп) сусветнай літаратуры і канон (Парнас) нацыянальнай літаратуры – пэўным чынам суадносяцца паміж сабой. Відавочна, што вяршыні («10») аднаго і другога канонаў не супадаюць. Так, Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, якія ўваходзяць у «дзясятку» нацыянальнага Парнаса, займаюць месца на іншым узроўні ў сусветным пантэоне. У той жа час Шэкспір, Дантэ, Сервантэс, уваходзячы ў «10» сусветнай літаратуры, займаюць іншае месца ў іерархічнай структуры нацыянальнага Парнаса. З гэтай прычыны можна гаварыць пра «неадпаведнасць» суадносін паміж іерархічнымі сістэмамі «нацыянальная літаратура» і «сусветная літаратура» з пазіцый агульначалавечага, «вечнага» ў іх, якая тлумачыцца найперш спецыфікай мастацкай творчасці ўвогуле: наяўнасць таленту або геніяльнасці ў творцы, сувымернай з «сусветнымі» патрабаваннямі, ступень яе выяўленасці ў творах, шляхі ўваходжання пісьменніка ў сусветны пантэон (адпаведныя яго творчаму майстэрству пераклады, вядомасць у іншамоўным асяроддзі, сярод прадстаўнікоў другога пакалення і г. д.). Другая прычына неадпаведнасці пантэонаў абумоўлена спецыфікай прыярытэтаў, на якія абапіраецца або з якіх сыходзіць сатворца, – асабістых, грамадскіх, дзяржаўных, нацыянальных, агульначалавечых.

На нашу думку, у сістэме фальклору Парнас беларускай казкі і Алімп казак народаў свету раўназначныя. У «залатым фондзе» казкі няма ўзроўняў па вертыкалі: «10», «100», «10 x 100», самыя знакамітыя ці меней знакамітыя і г. д. У ёй відавочна існуюць менавіта ўзроўні па гарызанталі, якую прадстаўляюць розныя народы свету (і адпаведна ім захаваліся беларускія, японскія, нямецкія… казкі) і якія адлюстроўваюць агульнае – нацыянальнае і «вечнае» – канкрэтна-гістарычнае, што выяўляецца ў гэтым жанры. Таму беларуская казка з’яўляецца адным з вышэйшых праяў і дасягненняў нацыянальнага і агульначалавечага, захаванага ў мастацкай форме, створанага на беларускіх землях і на роднай мове.

Другая выснова адносна месца беларускай класічнай літаратуры ў кантэксце сусветнай класікі, сфармуляваная з улікам фальклорных рэалій, звязана з супастаўленнем казкі з жанрамі напалову фальклорнымі (фабліо, народная кніга) і літаратурным (навела).

Так, параўноўваючы французскае фабліо «Завяшчанне асла» [5, *307–311*] і беларускую сацыяльна-бытавую казку «Пахаванне казла» [2, *422–423*], можна сказаць пра тыпалагічнае падабенства паміж творамі. Яно выяўляецца на розных узроўнях структуры мастацкага твора. На канцэптуальным узроўні ў творах падобныя тэма (святар бярэ хабар ад селяніна), ідэя (выкрыццё прадажнасці царкоўных служкаў), пафас (камічны / сатырычны). Сюжэт твора звязаны з рашэннем селяніна пахаваць жывёлу (асла, казла) на вясковых могілках, а святар дае на гэта сваё дабраславенне. Ёсць у творах адрозненні ў кампазіцыйным вырашэнні гэтага сюжэта. Галоўны герой твораў – стары, царква прадстаўлена сваімі служкамі: папом з «айцом дзяканам» і «архірэем» – у казцы, папом і епіскапам – у фабліо.

Напалову фальклорны жанр фабліо, вядомы ў французскай літаратуры, і сацыяльна-бытавая казка, якая захавалася ў беларускім асяроддзі, сыходзяцца ў дадзеным прыкладзе па большасці сваіх параметраў. У агульным кантэксце сусветнай літаратурнай класікі гэтыя творы могуць быць размеркаваны па шкале «ад фальклору да літаратуры». І беларускі прыклад жанру ў пэўным сэнсе запаўняе тое месца, якое ў французскай традыцыі, магчыма, ужо страчана. Так страчанае ў аднаго народа запаўняецца тым, што захавалася ў іншага народа. Параўнальнае вывучэнне літаратур дазваляе аднавіць перарваную гісторыка-культурную традыцыю і зрабіць сусветную класічную спадчыну цэласнай, шматузроўневай, шматфарбнай з’явай, сістэмай і структурай.

У народнай кнізе пра саксонскі горад Шыльду і яго жыхароў «Шыльдбюргеры» (XVI ст.), створанай у рэчышчы нямецкай рэнесанснай літаратуры і ў традыцыях «літаратуры пра дурняў», спалучыліся традыцыі жанраў гарадской літаратуры (шванкаў і анекдотаў). Беларуская казка «Дурныя людзі», запісаная ў XIX ст., па асобных матывах блізкая да нямецкай народнай кнігі. У ёй «дурнотай» апантаныя дзед з бабай, гаспадары адной хаты, мужыкі ды панічы, прадстаўнікі розных саслоўяў, як і ў Шыльдзе. У адрозненне ад «Шыльдбюргераў», дзе дурнямі сталі разумныя людзі, што вырашылі ад праблем свету «дурнотаю ратавацца» [6, *17–18*], у беларускай казцы дзейнічае (і проціпастаўлены «дурным людзям») салдат, разумныя дзеянні якога якраз і спрыяюць уратаванню ад «дурноты».

І ў дадзеным выпадку можна сказаць, маючы на ўвазе агульны кантэкст сусветнай класікі, што беларуская казка (і яе асобны прыклад) з’яўляецца ў пэўным сэнсе той цаглінкай, з якой складаецца больш вялікі гмах літаратурнага цэлага. І хоць гэтыя два прыклады прадстаўляюць розныя нацыянальныя літаратуры і два пэўныя этапы ў развіцці літаратурнага працэсу (ад фальклору да літаратуры), тым не менш частка і цэлае выступаюць тут у сваім адзінстве. Тое, што адсутнічае ў адной літаратуры, можа быць узноўлена і дапоўнена дзякуючы іншанацыянальнай спадчыне.

Літаратурны жанр навелы ўзнік на традыцыях розных жанраў (анекдота, фабліо, фацэцыі, прытчы, казкі, падання), дзе камічнасць, недарэчнасць або наўмысная складанасць сітуацыі вымагала ад героя хітрамудрасці, дасціпнасці, трапнасці паводзін або адмысловага адказу

(«вострага слова»). Сэрцавінай жанру з’яўляецца навіна – падзея, прыгода, прыклад, вакол якога пабудаваны сюжэт і дзякуючы якому ў ёй адбываецца нечаканы паварот. Такой «навіной» можа быць не толькі дзеянне, але і трапнае слова, паведамленне або адказ героя.

Беларускія казкі авантурна-навелістычнага кірунку пабудаваны на авантурна-прыгодніцкім, дасціпным, часам махлярскім сюжэце. Раздзел «Сацыяльна-бытавыя і авантурна-навелістычныя казкі» асобна выдзелены ў зборніку «Беларускія народныя казкі», у які «складальнікі пазбягалі ўключаць <…> творы іншых апавядальных жанраў – легенды, анекдоты і інш., хоць не заўсёды паміж гэтымі творамі і казкамі ёсць выразная мяжа», пра што піша ва ўступным слове К. П. Кабашнікаў [2, *10*]. У іх аснову пакладзена і хітрамудрасць героя, які сваімі паводзінамі або трапнымі размовамі правучвае або павучае хціўцу, зайздросніка, багацея. Значная частка казак авантурна-навелістычнага зместу пабудавана вакол «трапнага (вострага) слова». Вядомы цэлы шэраг твораў, дзе сюжэт зводзіцца да ўмовы: калі ты мяне (цара, папа, пана) падманеш, так што я скажу: «Хлусіш!», дык перамога будзе за табою, простым чалавекам (мужыком, салдатам), і ты атрымаеш нейкую ўзнагароду. Твор «Разышлося, як заечае сала» знаходзіцца на мяжы паміж анекдотам і казкай, разам з тым ён пабудаваны менавіта на «трапным слове», сказаным кучарам пану, які відавочна перабольшыў свае паляўнічыя заслугі.

Беларуская казка, такім чынам, выступае не толькі як прыклад тыпалагічных сыходжанняў паміж фальклорнымі творамі розных народаў, паміж фальклорным і напалову фальклорным або літаратурным творамі. Яна разглядаецца ў аспекце кантактных сувязей, як адзін з этапаў фарміравання літаратурных жанраў, у прыватнасці навелы. Аналізуючы беларускую казку ў параўнанні з іншанацыянальнымі творамі, становяцца бачнымі як кантактныя сувязі і ўзаемадзеянні, так і тыпалагічныя сыходжанні паміж беларускай і іншанацыянальнымі літаратурамі. Калі разглядаць жанр беларускай казкі ў супастаўленні з іншымі жанрамі (фальклорным – напалову фальклорным – уласна літаратурным), можна акрэсліць своеасаблівыя этапы/крокі фарміравання літаратуры з крыніц народнай свядомасці. Беларуская казка як уласна фальклорны жанр захавала некаторыя з’явы з таго, што іншыя народы страцілі. І ў гэтым сэнсе яна значна дапаўняе іншанацыянальны кантэкст, дзе падобны сюжэт або вобраз распрацоўваецца толькі ў літаратурных або напаўлітаратурных жанрах.

Не будзе перабольшваннем яшчэ раз пацвердзіць, што ў мінулым, якое крышталізавана ў жанры казкі, людзі, што жылі на беларускіх землях, былі роўныя з іншымі старажытнымі народамі, магчыма, апярэджвалі некаторых іншых у стварэнні мастацкіх каштоўнасцей, якія ўмацавалі «ядро» літаратурнай класікі. Безумоўна, што беларуская казка ўваходзіць у вышэйшыя ўзроўні сусветнага «залатога фонду» нароўні з казкамі іншых народаў свету. Гэта адна з найвялікшых каштоўнасцей нашага народа, што застаецца велічным помнікам і нашаму старадаўняму мінуламу, і мудрасці, таленавітасці людзей, што жылі на беларускіх землях.

# ЛІТАРАТУРА

1. *Адамовіч, Г. Я.* Літаратура – кантэкст – тэзаўрус / Г. Я. Адамовіч. Мінск, 2003.

2. Беларускія народныя казкі: зборнік / склад. Г. А. Барташэвіч, К. П. Кабашнікаў. – 2-е выд., дап. Мінск, 1986.

3. Великие писатели XX века / сост., общ. ред., предисл., послесл. П. В. Васюченко. М., 2002.

4. Аўтары найлепшых беларускіх кніг у XX стагодзьдзі: на падставе рэйтынгу ста беларускіх кніг у газэце «Наша Ніва» // Arche = Пачатак. – 2001. – № 1.; *Берт, Д.* Сто лучших литераторов: список самых выдающихся романистов, драматургов и поэтов всех времен : пер. с англ. / Д. Берт. М., 1999.; 100 шедьоври на съветската лирика : антология / под ред. Н. Антонова. София, 1977.

5. Зарубежная литература средних веков: учеб. пособие: в 2 вып. / сост. Б. И. Пуришев. – 2-е изд., испр. и доп. М., 1974. – Вып. 1: Латинская, кельтская, скандинавская, провансальская, французская литературы.

6. Шыльдбюргеры: [казкі / па-ням. пачуў, па-беларус. збаяў А. Клышка]. Мінск, 1983.

7. Японские сказки / пер. с яп. В. Марковой, Б. Бейко; предисл. В. Марковой. М., 1956.

8. *DiYanni, R.* The best in world literature / R. DiYanni. – 14th ed. – New Providence, 1994. – (Reader`s adviser ; vol. 2).